В настоящее время существует ряд причин, затрудняющих развитие агроэкотуризма. Среди них отсутствие или низкая комфортность инфраструктуры, отсутствие единой стратегической концепции, при которой агроэкотуризм интегрировался бы в планы государственного социально-экономического развития в комплексе с развитием сельского хозяйства, транспорта, лесной промышленности и т. д. На темпы развития агроэкотуризма также влияют отсутствие у персонала агроэкоусадеб опыта, неравномерность распределения информации о субъектах рынка туристических услуг, неспособность рынка контролировать качество предлагаемого турпродукта.

Вместе с тем, стимулирующее воздействие на инновационные процессы в развитии агроэкотуризма оказывают нормативно-правовые акты государственного и регионального масштаба, определяющие разработку концепций развития устойчивого агроэкотуризма.

## МАГЧЫМАСЦІ ЎКЛЮЧЭННЯ Ў ТУРЫСТЫЧНУЮ ДЗЕЙНАСЦЬ ЭТНАТУРЫСТЫЧНЫХ РЭСУРСАЎ ПАНЁМАННЯ

***Карнялюк В. Р.***, *Гродзенскі дзяржаўны універсітэт*

Развіццё ўязднога турызму ў Беларусі толькі пачынаецца. Пры тым наша краіна мае ўласныя характарыстыкі, якія даюць магчымасць ўзбагаціць турыстычную індустрыю памежнага краю, які гістарычна, дэмаграфічна, канфесійна, этнічна і экалагічна ўяўляе сабою пэўны культуралагічны і прыродны феномен Усходняй Еўропы, а значыць мае патэнцыяльную і рэальную турыстычную прывабнасць.

Разам з такімі элементамі турыстычнай індустрыі, як развіццё прыватнага сектару гаспадаркі, удасканальванне нарматыўна-прававой базы, фарміраванне інфраструктуры і г.д., адметнаю часткаю аптымізацыі магчымасцяў турыстычнай індустрыі рэгіёну Беларусі з’яўляюцца этнатурыстычныя традыцыі. Гэта арганізацыі, установы і прыватныя (фізічныя) асобы, якія маюць патэнцыяльныя магчымасці для ўдзелу ў арганізацыі турызму. На сённяшні дзень яны выкарыстоўваюцца ў нашай краіне ў недастатковай ступені. У Беларусі захавалася традыцыйная культура, якая патэнцыяльна цікава для развіцця турындустрыі. Аднак нам бракуе наладжанага механізму стварэння і прасоўвання да спажыўца якаснага, прывабнага турпрадукта.

Адсутнасць механізму выкарыстання этнакультурнага багацця беларуска-польскага памежжа турыстычнай індустрыяй Беларусі з’яўляецца адным з фактараў нездавальняючага ўзроўню турыстычнай прывабнасці нашай краіны для еўрапейскіх і расійскіх тураператараў і турыстаў.

Адным з накірункаў рашэння дадзенай праблемы бачыцца ўсталяванне шчыльных кантактаў з Польшчай. Напраўду кажучы, з польскага боку ў большасці страчаны (па прычыне міграцый і урбанізацыі) аўтэнтычная традыцыйная культура. Аднак там існуе немалы досвед у стварэнні прывабных турыстычных прадуктаў, склалася практыка падрыхтоўкі высокакваліфікаваных спецыялістаў у галіне туріндустрыі. Сінтэз магчымасцяў двух бакоў дасць магчымасць павелічэння турыстычнай прывабнасці рэгіёна, а таксама будзе спрыяць рэкаструяванню і адраджэнню народных традыцый ў Панёманні і Падляссі.

Зыходзячы з аналізу наяўных і патэнцыяльных магчымасцяў двух — беларускага і польскага — бакоў, можна вызначыць наступныя напрамкі практычнай дзейнасці для вырашэння згаданай намі праблемы. Такімі напрамкамі могуць быць: 1) правядзенне цыклу сумесных краязнаўча-этнаграфічных экспедыцый для вылучэння этнакультурных адметнасцяў рэгіёну з наступным выданнем шэрагу інфармацыйных і метадычных выданняў; 2) вызначэнне лакалізацыі наяў-

насці Аўгустоўскай пчалы ў зоне Аўгустоўскага канала ў якасным і колькасным аспектах; 3) даследаванне пчалярскіх мясцовых тэхналогій, этнакультурных асаблівасцяў рэгіёну і пчалярскай тэрміналогіі з мэтаю практычнай дапамогі польскаму боку ў захаванні і пашырэнні тэрыторыі існавання Аўгустоўскай пчалы; 4) арганізацыя майстар-класаў па адукацыі пастаўшчыкоў этна-турыстычных паслуг — майстроў народных рамёстваў, этнаграфічных мастацкіх калектываў, музейных супрацоўнікаў; 5) арганізацыя і правядзенне адукацыйных курсаў для спецыялістаў турыстычнай індустрыі па практыцы этнатурызму; Правядзенне маркетынгавага аналізу попыту на этнатурыстычныя паслугі ў Польшчы і Беларусі (раёны Панёмання і Падлясся); 6) распрацоўка сцэнарыяў анімацыйных праграм для арганізацыі адпачынку ўдзельнікаў этнатураў і іншых відаў тураў з этнічным зместам; 7) распрацоўка і правядзенне рэкламнай кампаніі па пазіцыяніраванню этнатурыстычнай прывабнасці краю; 8) правядзенне серыі мерапрыемстваў па экалагічнаму мэнеджменту тэрыторыі этнатурыстычнай рэкрэацыі Панёмання і Падлясся з наступным фармуляваннем практычных рэкамендацый; 9) фарміраванне і правядзенне этнатураў альбо пазнавальных тураў ці настальгічных тураў з улікам этнаграфічных адметнасцяў (напрыклад: «Мядовая сцежка», «На свята Аўгустоўскай пчалы!», «Да вытокаў поразаўскай керамікі», «У госці да татараў Панямоння», «Габрэйскі свет краю», «Балты ў помніках прыроды і культуры Гродзеншчыны і Аўгустоўскага краю») у форме паездак, прагулак, паходаў для груп рознай падрыхтаванасці, у якасці *study*-тураў у беларуска-польскім памежжы для прадпрымальнікаў і студэнтаў турыстычных спецыяльнасцяў Беларусі і Польшчы.

Вынікам такой дзейнасці можа стаць новая магчымасць турысцкага выкарыстання рэгіёну Панёмання. Такой магчымасцю будуць такія фактары далейшага развіцця, як арыгінальныя турыстычныя прадукты на падставе этнакультурнага і прыроднага патэнцыялу беларуска-польскага памежжа, ўзятыя ва ўжытак турыстычнымі фірмамі і арганізацыямі для павелічэння турыстычнай прывабнасці рэгіёна. Таксама немалаважным фактарам развіцця можна лічыць далейшае развіццё і актуалізацыю народных культурных традыцый, унікальнай этнічнай культуры, уключэнне ў турыстычную дзейнасць культурных аб'яднанняў малых этнічных супольнасцяў — яўрэяў, татараў, палякаў у Беларусі і беларусаў у Польшчы, літоўцаў і іншых народаў, што пражываюць у рэгіёне; стварэнне ўмоў для іх супрацоўніцтва ў дадзенай сферы для рэкламы мясцовай гісторыі і культуры.

Асобным месцам ў шэрагу актуальных вынікаў пералічаных намаганняў, навачавідкі, будзе забяспячэнне магчымасцяў працаваць ў галіне турызму жыхарам мікрарэгіёнаў, стварэнне ў гэтых мясцовасцях новых працоўных месцаў.

Створаная сістэма падрыхтоўкі і перападрыхтоўкі спецыялістаў этнатурызму можа стаць перспектыўным накірункам развіцця айчыннай сістэмы вышэйшай турыстычнай адукацыі.

Усё разам будзе спрыяць аптымізацыі айчыннай турыстычнай індустрыі і, як вынік, павялічэнню турыстычнай прывабнасці нашай краіны.

## ФОРМИРОВАНИЕ КОНКУРЕНТОСПОСОБНОГО ТУРИСТИЧЕСКОГО ПРОДУКТА В РЕСПУБЛИКЕ БЕЛАРУСЬ (на примере развития агроэкотуризма)

***Копоть Ю. А.***, *Министерство спорта и туризма Республики Беларусь*

В развитии белорусского туризма значительная роль принадлежит агроэкотуризму.

Указом Президента Республики Беларусь от 2 июня 2006 г. № 372 «О мерах по развитию агроэкотуризма в Республике Беларусь» (далее — Указ) закреплено признание того, что деятельность физических лиц и крестьянских (фермерских) хозяйств по оказанию услуг в сфере агроэкотуризма не является предпринима-